

**Прагpама тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**





Беларускамоўная паштоўка — гэта нешта большае, чым звычайная віншавальная картка. Заўсёды прыемна атрымліваць менавіта такія паштоўкі, бо ў іх ужо адразу адчуваецца не проста свята, а яшчэ і сувязь з каранямі.

СТАР 7



Адзначаць Новы год можна па-рознаму, асабліва цяпер, калі з'явілася столькі магчымасцяў. Сёння на тэму сустрэчы Новага года паспрачаліся прыхільнік традыцый і аматарка навамодных тэндэнцый.

СТАР 8


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 СНЕЖНЯ 2012 г. ПЯТНІЦА № 249 (27364) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# БЫЦЬ САПРАЎДНЫМІ ПАТРЫЁТАМІ СВАЁЙ АЙЧЫНЫ

**Пажадаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка хлопчыкам і дзяўчынкам учора на навагоднім дабрачынным свяце ў ходзе акцыі «Нашы дзеці».**

«Мы, дарослыя, гэтак жа, як вы, дзеці, радуемся прыходу Новага года, — сказаў Прэзідэнт. — Мы радуемся таму, што вы прымушаеце нас сустракаць з радасцю гэта вялікае і добрае свята».

Па традыцыі галоўная ёлка краіны з'яўляецца кульмінацыяй акцыі «Нашы дзеці»: «Па ўсёй краіне ў кожным кутку да дзяцей прыходзяць дарослыя і прыносяць падарункі». «Гэта вялікая акцыя, і толькі ў Беларусі яна набыла такі маштаб», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, падзякаваўшы ўсім дарослым, якія арганізавалі і маюць дачыненне да правядзення гэтай дабрачыннай акцыі.

Звяртаючыся да прысутных у вялікай зале Палаца Рэспублікі хлопчыкаў і дзяўчынак, Прэзідэнт адзначыў, што права прысутнічаць на гэтым урачыстым мерапрыемстве яны заслужылі сваёй упартай працай і вучобай. Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў, што Новы год прыносіць з сабой яшчэ адну радасць — канікулы. Ён пажадаў дзецям, каб яны з карысцю правялі гэтыя дні, прысвяцілі сябе музыцы, чытанню і, асабліва, спорту, каб быць моцнымі і здаровымі. «Гэта будзе самая вялікая радасць для нас, дарослых», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Напярэдадні галоўнай ёлкі краіны дзеці, якія прыехалі на гэта свята з рэгіёнаў, мелі магчымасць наведаць самыя цікавыя аб'екты ў сталіцы Беларусі.

Словы ўдзячнасці Аляксандр Лукашэнка таксама адрасаваў настаўнікам і выхавальнікам, прызнаўшы, што яны цяпер крыху абдзелены ўвагай дзяржавы. «Але мы гэту справу паправім у будучым годзе», — запэўніў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы пажадаў, каб у гэтыя выхадныя бацькі больш часу правялі са сваімі дзецьмі, ператварыўшы Новы год цяпер у сямейнае свята. «Няхай гэтыя дні прынясуць толькі добры настрой і эмоцыі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

На галоўную ёлку краіны запрошаны 2 тыс. 370 дзяцей ва ўзросце 8-14 гадоў з розных рэгіёнаў Беларусі. Сярод іх дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, выхаванцы дзіцячых інтэрнатных устаноў, дзеці-інваліды, дзеці са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў. На свята таксама запрошаны пераможцы міжнародных, рэспубліканскіх, абласных і раённых алімпіяд, творчых конкурсаў і спартыўных спаборніцтваў, навучэнцы, якія дасягнулі поспехаў у грамадскай рабоце. Акрамя таго, на галоўнай ёлцы краіны прысутнічалі навучэнцы Беларускай сярэдняй школы імя Францыска Скарыны г. Вільнюса і Рыжскай беларускай школы.

Пасля прагляду казачнага музычна-сцэнічнага шоу ў выкананні лепшых творчых калектываў краіны дзецям уручылі падарункі ад імя Прэзідэнта Беларусі. Дзеці ў сваю чаргу таксама паднеслі кіраўніку дзяржавы падарункі, зробленыя сваімі рукамі.

**БЕЛТА.**









Фота БЕЛТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль ЖАРКО, міністр аховы здароўя:**

***«У Беларусі робіцца ўсё для захавання здароўя дзяцей. Ахова мацярынства і дзяцінства — адзін з прыярытэтаў сацыяльнай палітыкі дзяржавы. Меры, якія прымаюцца для павелічэння нараджальнасці, умацавання сям'і, захавання здароўя маці і дзяцей, прыносяць свой плён. Дзяцей у гэтым годзе нарадзілася на 5 тысяч больш у параўнанні з мінулым годам. Знізілася дзіцячая смяротнасць. Мы захаваем назапашаны патэнцыял і наросцім яго не толькі ў плане абароны мацярынства і дзяцінства, але і ў сістэме аховы здароўя па паляпшэнні якасці, даступнасці медыцынскай дапамогі».***

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | | |
|---|---|---|
| Брэст | – 3° | |
| Віцебск | – 2° | |
| Гомель | + 1° | |
| Гродна | – 3° | |
| Магілёў | – 2° | |
| Мінск | – 6° | |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.12.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8550,00 | ▲ |
| Еўра | 11320,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 280,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1063,43 | ▼ |

Яўген ВОРСІН:

## ПЫТАННЕ АБ ПЕРАНОСЕ З МІНСКА ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ ПА ХАКЕІ 2014 ГОДА БОЛЬШ НЕ АБМЯРКОЎВАЕЦЦА

**Да мінскага чэмпіянату свету па хакеі яшчэ 500 дзён, але арганізатары ўжо даўно рыхтуюцца да знакавай падзеі беларускага спорту. І не дзіўна, бо мы не ЗША, Расія і не Германія. Такіх буйных спаборніцтваў Беларусь пакуль не прымала, а таму ў падобным праекце важна яшчэ загадзя адпрацаваць кожны механізм, кожную дробязь. Вось і Яўген Ворсін, старшыня федэрацыі хакея Рэспублікі Беларусь, вырашыў адкрыта паразмаўляць з журналістамі аб тым, што для сусветнага першынства ўжо зроблена, пра тое, што яшчэ неабходна зрабіць.**

— Пэўны час таму блукалі думкі, ініцыяваныя Сенатам ЗША, Еўрапарламентам, байкатаваць чэмпіянат у Беларусі, зыходзячы з нейкіх палітычных меркаванняў. Але іх адштурхнуў і Рэнэ Фазэл, прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі хакея (ІІХФ), і дэлегаты кангрэса федэрацыі. Мы атрымалі афіцыйнае запэўненне, што падобныя пытанні ўзнікаць больш не будуць. Чэмпіянат свету адбудзецца ў Беларусі ў маі 2014 года. Гэта адназначна.

Яўген Мікалаевіч таксама адзначыў, што Беларусь нават апярэджвае план падрыхтоўкі.

— У нас ужо адбыліся 3 праверкі Міжнароднай федэрацыі. І ніводная з інспекцый не выявіла невыканання з боку рэспублікі пэўных абавязацельстваў, якія мы ўзялі на сябе. У дакладзе Хорста Ліхтнэра, генеральнага сакратара ІІХФ, сказана, што Беларусь не проста рыхтуецца, а ў шматлікіх пазіцыях апярэджвае план дзеянняў па падрыхтоўцы чэмпіянату.

СТАР. 2

■ Беларускай чыгунцы — 150 гадоў

## ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ

**Станцыя Парэчча, што непадалёк ад Гродна, стала месцам знаёмства з гістарычным мінулым.**

...Ліхтары ў стылі XIX стагоддзя, брукаваны перон і цягнік, акурат такі, як і больш чым стагоддзе таму. Усе гэтыя атрыбуты змаглі ўбачыць удзельнікі мерапрыемства ў Парэччы, куды адправіўся рэтра-цягнік. Па інфармацыі прэс-службы Беларускай чыгункі, каб гэтая задумка спраўдзілася, давялося шмат рыхтавацца. Па-першае, аднавіць старыя паравозы, чым займаліся ў лакаматыўных дэпо Ліды і Ваўкавыска, па-другое — зрабіць больш камфортнымі будынак станцыі і тэрыторыю вакол яго.

Таксама пры дапамозе акцёраў Гродзенскага абласнога тэатра спецыяльна да гэтага дня рыхтавалася рэканструкцыя гістарычных падзей. Акцёры прыбылі на станцыю ў вобразе чыноўнікаў з Санкт-Пецярбурга, якія сваім візітам засведчылі пачатак развіцця Беларусі чыгункі. Стварыць атмасферу даўніны дапамагло яшчэ і пераўвасабленне, якое датычылася не толькі акцёраў, але і супрацоўнікаў чыгункі — машыніста, памочніка машыніста, дзяжурнага па станцыі, кандуктара ў рэтра-цягніку. Адпаведныя касцюмы для іх былі створаны спецыяльна ў швейным цэху Баранавіцкага аддзялення беларускай магістралі.



Фота БЕЛТА.

Адпраўленне рэтра-цягніка — адно з мерапрыемстваў, прымеркаваных да 150-годдзя Беларускай чыгункі. Участак Гродна — Парэчча, па якім і праехаў рэтра-цягнік, адкрылі ў 1862 годзе. Ён належыць да першай чыгункі, што прайшла праз Беларусь. Парэчча міналі на сваім шляху ўсе, хто дабіраўся з Пецярбурга ў Варшаву.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## ПАСПЯХОВАСЦЬ БІЗНЭСУ ЗАЛЕЖЫЦЬ... АД ШКОЛЬНАГА НАСТАЎНІКА

**«Суадносіны колькасці настаўнікаў да колькасці вучняў у Беларусі — адны з самых нерацыянальных у Еўропе, — аб гэтым заявіў міністр адукацыі Сяргей Маскевіч, адказваючы на прэс-канферэнцыі на пытанне журналіста «Звязды». — І калі вымяраць эфектыўнасць дзейнасці адукацыйнай галіны эканамічнымі катэгорыямі, то яна ў нашай краіне таксама вельмі нізкая. Таму сёння востра стаіць пытанне, як яе павысіць»**

Як вядома, у 2013 годзе павінен стартаваць эксперымент па ўкараненні новай мадэлі фінансавання агульнай сярэдняй адукацыі на падставе нарматыву бюджэтнай забяспечанасці на навучанне і выхаванне аднаго навучэнца.

— Я спадзяюся, што ў эксперыменце будуць задзейнічаны не толькі асобныя ўстановы, але і ўсе агульнаадукацыйныя ўстановы горада Баранавічы. І я веру, што гэты эксперымент пакажа вялікую зацікаўленасць у яго канчатковых выніках як саміх устаноў адукацыі, іх кіраўнікоў, так і педагогаў, бацькоў, — падкрэсліў Сяргей Маскевіч. — Спадзяюся, што пры новай сістэме фінансавання будуць практыкавацца зусім іншыя падыходы пры фарміраванні педагагічных калектываў. І кіраўнік установы ўжо не будзе браць на работу любога выпускніка педагагічнай ВНУ, а будзе запрашаць да сябе толькі тых, хто сапраўды гэтай школе падыходзіць, будзе даражыць настаўнікамі-пенсіянерамі, калі праца вопытных педагогаў будзе запатрабавана вучнямі і іх бацькамі.

Сёння мы выпускаем на рынак працы штогод 6 тысяч маладых педагогаў. Але навошта нам выпадковыя людзі ў педагагічных ВНУ, якія прыходзяць туды толькі дзеля атрымання дыплома? Магчыма, нам хапіла б і 4 тысяч маладых педагогаў, але такіх, якія выбіраюць педагагічную спецыяльнасць мэтанакіравана і не збіраюцца праз два-тры гады пакідаць галіну, высокакваліфікаваных і матываваных на работу з дзецьмі. Мяркую, што калі будзе прынята новая рэдакцыя «Правілаў прыёму ў ВНУ» і школьныя медалісты, а таксама прызёры абласных алімпіяд змогуць паступаць на мэтавую падрыхтоўку на педагагічныя спецыяльнасці ўвогуле без здачы цэнтралізаванага тэсціравання, то гэта дазволіць нам істотна палепшыць якасны склад студэнтаў педагагічных спецыяльнасцяў.

У якасці аднаго з рэзерваў падтрымкі сістэмы адукацыі Сяргей Маскевіч назваў дапамогу рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій.

— Кіраўнікі кампаній і карпарацый разумеюць, што паспяховасць іх бізнэсу вызначаецца сёння тымі, хто сядзіць за камп'ютарамі, заўтра яна будзе вызначацца тымі, хто навучаецца сёння ў ВНУ, а паслязаўтра — тымі, хто яшчэ навучаецца ў школе. Прасцей кажучы, менавіта школьныя настаўнікі фізікі і матэматыкі стануць тымі людзьмі, якія будуць забяспечваць іх фінансавы поспех у зусім недалёкай будучыні...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ГЕНАСАМБЛЕЯ ААН АБВЯСЦІЛА 2014-2024 ГАДЫ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕМ УСТОЙЛІВАЙ ЭНЕРГЕТЫКІ

Генасамблея ААН прыняла рэзалюцыю аб аб'яўленні 2014-2024 гадоў Дзесяцігоддзем устойлівай энергетыкі для ўсіх, падкрэсліўшы важнасць сучасных паслуг у сферы экалагічна ўстойлівага энергазабеспячэння для ліквідацыі беднасці і развіцця ў цэлым. Асамблея рэкамендавала прыняць меры па забеспячэнні эканамічнай эфектыўнасці выкарыстання новых і аднаўляльных крыніц энергіі шляхам больш актыўнага аказання дапамогі ў галіне навуковых даследаванняў і доследна-канструктарскіх распрацовак. Рэзалюцыя заклікае ўрады да мабілізацыі фінансавых рэсурсаў, нарошчвання патэнцыялу і распаўсюджвання новых і існуючых экалагічна бяспечных тэхналогій. Генеральная асамблея ААН таксама рэкамендавала ўрадам ствараць спрыяльныя ўмовы для папулярызацыі і выкарыстання новых і аднаўляльныя крыніц энергіі і больш эфектыўнага энергаспажывання.

### У ЗША З-ЗА НЕПАГАДЗІ АДМЯНІЛІ 2000 АВІЯРЭЙСАЎ



У ЗША з-за непагадзі на працягу трох дзён адмянілі больш за дзве тысячы авіярэйсаў. У прыватнасці, прычынай экстранных мер сталі моцны вецер і наледзь на ўзлётна-пасадачных палосах. Акрамя таго, стыхія прывяла да шэрагу здарэнняў, ахвярамі якіх сталі сем чалавек. Ураган з боку Мексіканскага заліва абрынуўся на ўсходняе ўзбярэжжа краіны. Моцны вецер суправаджаецца снегападам і ледзяным дажджом. Па даных WTVR-TV, месцамі яго парывы дасягаюць 36 метраў у секунду. Паводле прагнозаў метэаролагаў, у некаторых штатах вышыня снежнага покрыва да 47 сантыметраў.

### ПАСЛЯСВЯТОЧНЫЯ ДЫЕТЫ ЗАБІВАЮЦЬ ПЕЧАНЬ?

Гепатолагі — спецыялісты па здароўі печані — папярэджваюць: людзі, якія думаюць, быццам змогуць справіцца з наступствамі бурных навагодніх застолляў дэтокс-дыетай, цешаць сябе пустымі надзеямі. Паводле вынікаў даследавання арганізацыі Hepatitis Australia, каля 70% чалавек з 600 апытаных былі ўпэўнены: дыеты, якія чысцяць печань і ўключаюць выкарыстанне дэтокс-прэпаратаў, паляпшаюць здароўе. Аднак такія прадукты могуць не працаваць ці нават нашкодзіць, кажа Сайман Страсэр з Таварыства гастраэнтэролагаў. Паводле яго слоў, тлушч адкладваецца ў клетках печані, і дыеты з гэтым нічога не ў стане зрабіць. Гэта значыць, на самой справе, у печані ніякія таксіны не запасяцца. Лепш на працягу ўсяго года сачыць за сваім рацыёнам, мала выпіваць і весці здаровы лад жыцця. Калі ж у чалавека ўжо ёсць хвароба печані, дэтокс-дыета яму адназначна нашкодзіць. Нечаканае і рэзкае зніжэнне вагі можа прывесці да павышэння канцэнтрацыі тлушчу ў печані. З-за гэтай хваробы развіваецца запаленне і працэс рубцавання, што пагражае цырозам і нават ракам. Аналагічны эфект выклікае спажыванне алкаголю.


ISSN 1990 - 763X


ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### НАТА ПАЧЫНАЕ РАЗГОРТВАЦЬ КОМПЛЕКСЫ PATRIOT КАЛЯ СІРЫЙСКАЙ МЯЖЫ



НАТА разгортвае 2 ракетна-зенітныя комплексы Patriot, прадастаўленыя ЗША, на поўдні Турцыі каля горада Газіянтэп. Яны будуць базіравацца паблізу ад сірыйскай мяжы. Яшчэ чатыры РЗК ад Германіі і Нідэрландаў стануць выконваць ролю другога эшалона, перадае ІТАР-ТАСС са спасылкай на крыніцы ў Паўночнаатлантычным альянсе.

Радарныя сістэмы амерыканскіх Patriot, размешчаныя ў Газіянтэпе, змогуць выяўляць аб'екты ў паветранай прасторы над Алепа — другім па велічыні горадам Сірыі, а таксама над правінцыяй Ідліб.

Абслугоўваць і ахоўваць 6 комплексаў будуць каля 1,2 тыс. вайскоўцаў ЗША, ФРГ і Нідэрландаў. Паводле папярэдніх ацэнак, ЗРК змогуць стаць на баявое дзяжурства ўжо ў студзені.

Афіцыйны запыт Турцыі быў накіраваны ў НАТА 21 лістапада, і 4 снежня альянс прыняў рашэнне аб узмацненні сістэмы супрацьпаветранай абароны турэцкай дзяржавы — размяшчэнні на яго тэрыторыі зенітна-ракетных комплексаў Patriot для абароны ад Сірыі.

Раней Расія, якая падтрымлівае Дамаск, выказвала асцярогі з нагоды магчымага размяшчэння ракет на мяжы з Сірыяй. Між тым, Тэгеран выступіў супраць устаноўкі ракет НАТА, лічачы гэта ўварваннем Захаду ў рэгіён, і заявіў, што такія меры «могуць прывесці да Трэцяй сусветнай вайны», паведамляе Turkish Press.

КОРАТКА

Беларусь і Казахстан дамовіліся аднавіць абмен Днямі культуры. У 2013-2014 гадах такія культурныя форумы пройдуць у Беларусі і ў Казахстане. Перад гэтым быў перапынак у правядзенні Дзён культуры на працягу некалькіх гадоў.

Колькасць шлюбаў у Беларусі працягвае зніжацца, а колькасць разводаў па-ранейшаму расце. У студзені-лістападзе бягучага года на 1000 шлюбаў прыпадала 492 разводы (у студзені-лістападзе 2011 года на 1000 шлюбаў было 419 разводаў).

Арандаваць кватэру ў Віцебскага гарвыканкама можна ў сярэднім за Br500 тыс. і аплату камунальных паслуг. Каля двух дзясяткаў кватэр, якія знаходзяцца на балансе бюджэту, гарадскія ўлады здаюць унаём грамадзянам, якія маюць патрэбу ў жыллі.

Стаянкі для трэйлераў прапануецца ствараць пад Мінскам, а ў якасці пляцовак выкарыстоўваць тэрыторыі загарадных лагераў і санаторыяў.

У Беларусі з 1 студзеня 2013 года больш як на 20 працэнтаў павышаюцца цэны на асобныя маркі цыгарэт як выробленых у рэспубліцы, так і імпартаваных.

## ЦІ ЛІЧЫЦЕ ВЫ, ШТО СУСТРАКАЮЦЬ ПА ВОПРАТЦЫ?



**Ганна Благава, салістка Моладзевага тэатра эстрады:**

— Насамрэч я лічу, што так. Пацвярджэнне гэтаму я знаходжу практычна штодня. Сама, напрыклад, праводжу людзей заўсёды па розуме, але сустракаю па вопратцы. Гэта вельмі важна для любога чалавека — выглядаць добра, што, у прынцыпе, нескладана зрабіць. Каб сваім выглядам не адштурхоўваць ад стасункаў, а, наадварот, натхняць на зносіны з іншымі людзьмі. Для артыстаў гэта наогул вельмі важна, таму што спачатку чалавек бачыць і ацэньвае сцэнічны вобраз. Таму нас якраз сустракаюць па вопратцы. І калі ты выглядаеш добра, цікава, то чалавек пачне слухаць, што ты спяваеш і як.



**Гражына Паўлоўская, кандыдат філалагічных навук:**

— У некаторым сэнсе — так. Першае ўяўленне фарміруецца менавіта так, па гэтым прынцыпе. Першае ўражанне складаецца ў нейкія мілісекунды. Потым ужо з нейкіх іншых дэталяў, у працэсе зносін. Я сваё першае ўражанне складаю не столькі па вопратцы, колькі па маім візуальным успрыманні чалавека. По вопратцы — гэта вельмі вузка.



**Пятро Васючэнка, пісьменнік:**

— Сустракаюць сэрцам заўсёды. Калі чалавек прыемны, няхай апранаецца хоць у рыбацкую сетку. Вопратка калі адыгрывае нейкую ролю, то хіба што ў трэцюю чаргу.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ПЫТАННЕ АБ ПЕРАНОСЕ З МІНСКА ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ ПА ХАКЕІ 2014 ГОДА БОЛЬШ НЕ АБМЯРКОЎВАЕЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ужо даўно вядома, першынство прыме «Мінск-Арэна», з якой так усё зразумела: цудоўны комплекс, які можа прымаць самыя разнастайныя спаборніцтвы. А што чуваць пра «Чыжоўку-Арэну», якая стане другой пляцоўкай правядзення хакейнага турніру?

— Яна знаходзіцца ў заключнай стадыі будаўніцтва, — кажа Ворсін. — На асноўнай арэне зараз укладваюць трубы, праводзяць усе тэхналагічныя работы, звязаныя з падрыхтоўкай лядовай пляцоўкі. Усе астатнія канструктыўныя рашэнні па падрыхтоўцы «Чыжоўкі-Арэны» выконваюцца з улікам спартыўнага рэгламенту, бо сам праект быў распрацаваны пад чэмпіянат свету. Там усё прадугледжана. Мы ўжо распрацавалі ўсе схемы размяшчэння не толькі раздзявальняў, але і медыцынскага кабінета, прэс-цэнтра, акрэдытацыйнага цэнтра, офісных памяшканняў.

Напэўна, адно з асноўных пытанняў для арганізатараў будучага форуму — жыллёвае. Прыходзілася чуць шмат заўваг наконт таго, што Мінск не здолее прыняць усіх ахвотных пабачыць вялікі хакей. Цікава, як вырашаецца гэтае пытанне?

— Зараз мы ўжо рэальна прадэманстравалі тыя атэлі, якія прызначаны для прыняцця афіцыйных гасцей. Гэта 14 гасцініц. Нумаровы фонд — 2,5 тысячы месцаў. Няма сумненняў, што афіцыйныя прадстаўнікі будуць мець цудоўныя месцы размяшчэння. Мне казалі, што ёсць праблемы з харчаваннем. Паверце, харчаваннем у Мінску будуць забяспечаны ўсе ўдзельнікі і балельшчыкі.

Дарэчы, пра заўзятараў. Сталіца адначасова здолее прыняць да 20 тысяч турыстаў. «Усіх іх забяспечаць месцамі размяшчэння. Найперш гэта тычыцца студэнцкай вёскі на 8 тысяч месцаў, якую дабудуюць у наступным годзе. Гэта танныя для пражывання, але камфортныя інтэрнаты. Акрамя іх, балельшчыкаў прымуць яшчэ 11 інтэрнатаў нашых вышэйшых навучальных устаноў. Там праводзяць рэканструкцыю, перапланіроўку, аднак яны ўсе будуць добрай якасці. Для турыстаў прадугледжана таксама і культурная праграма».

На сустрэчы з журналістамі агучылі яшчэ адну цікавую інфармацыю — перш-наперш для турыстаў і балельшчыкаў. Вядома, што талісманам чэмпіянату стане зубраня. Толькі імя яму пакуль яшчэ не далі. А таму ў студзені будзе праведзены адмысловы конкурс, у якім паўдзельнічаць зможа любы ахвотны. Далучайцеся!

**Тарас ШЧЫРЫ.**

■ Асяродак пражывання

# ПЛАЦІ ЗА МЕСЦА ДЛЯ АЎТО, А НЕ ЗА ГАРАДСКУЮ ПРАСТОРУ

**У наступным годзе ў сталіцы плануецца рэалізаваць тры праекты па будаўніцтве аўтамабільных паркован. Стаянкі будуць у раёне вуліц Цімашэнкі і Шаранговіча (на 200 машына-месцаў) у мікрараёне Брылевічы (на 500 месцаў), а таксама на Ангарскай (два аб'екты па 300 машына-месцаў кожны). Пра гэта паведаміў журналістам наместнік генеральнага дырэктара ўнітарнага прадпрыемства «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі» Пётр ПРУДНІКАЎ на пасяджэнні «круглага стала».**

Сёлета за кошт сродкаў бюджэту Мінска было створана 11 тысяч парковачных месцаў і 1,2 тысячы месцаў для захоўвання транспартных сродкаў. Абмеркаванне праблем паркован у сталіцы на слыху ўжо не адзін год. Ды гучаць яны актуальна і сёння. І маштабнасць такая сітуацыя набывае ўсё большую, а вось варыянты рашэння пакуль што застаюцца толькі на ўзроўні ідэй. Бо тыя, хто сёння мае свой аўтамабіль, часта не зацікаўлены ў тым, каб плаціць за месца паркоўкі. Адсутнічае гэты стымул з-за таго, што многія не адчуваюць такой патрэбы: маўляў, навошта мне плаціць, калі магу пакінуць аўтамабіль каля пад'езда ўласнага дома? Як варыянт, можна разглядаць увядзенне штрафаў для кіроўцаў, якія пакідаюць транспартны сродак, парушаючы правілы паркован. Але патрэбны і людзі, якія будуць адсочваць гэтыя парушэнні. Таму павінна запрацаваць цэлая сістэма, каб былі нейкія зрухі. Можна было б паспрабаваць прывязваць рэгістрацыю аўтамабіля да парковачнага месца. Гэта можа быць гараж ці доўгатэрміновая дамова на такое месца ў паркінгу. Можа, і з'явілася б урэшце зацікаўленасць у людзей аплачваць карыстанне месцам, а не гарадской прасторай?

Як гаварылася на прэс-канферэнцыі, няблага паўплывалі б на сітуацыю і стаянкі, што «перахоплівалі» б транспартныя сродкі на ўездзе ў горад. Аўтамабіль, уязджаючы ў горад, у той ці іншай ступені наносіць шкоду, хоць і надае перавагу свайму ўладальніку з камфортам трапіць у пункт прызначэння. Альтэрнатывай магло б стаць выкарыстанне веласіпедаў. Яны маюць свае плюсы, але для іх, напрыклад, не хапае спецыяльных дарожак. І вопыт тых жа еўрапейскіх краін, дзе гэты транспартны сродак можна браць напракат, у нас яшчэ не прыжыўся.

А той жа транзітны транспарт не будзе трапляць у горад, калі пачне паўнавартасна дзейнічаць кальцавая дарога. Сёння толькі працягваецца праца ў гэтым кірунку, але завяршэнне яе — справа дня заўтрашняга.

**Алена ДРАПКО** ■

■ Тры пытанні з нагоды

Анатоль МАРКЕВІЧ, старшыня Навагрудскага райвыканкама:

# «БУДУЕМ З БІЗНЭСАМ ПАРТНЁРСКІЯ АДНОСІНЫ»

**Нагодай для пытанняў Анатолю МАРКЕВІЧУ, старшыні Навагрудскага райвыканкама, стаў прэс-тур журналістаў рэгіянальных і рэспубліканскіх СМІ ў гэты рэгіён. Там не толькі шануюць сваю гісторыка-культурную спадчыну, але і імкнуцца на сучасным узроўні развіваць эканоміку і сацыяльную сферу.**



Фота Кацярыны БЕСАРАБ.

***— Анатоль Мечыслававіч, як развіваецца на Навагрудчыне прыватны бізнэс, якія ў яго прыярытэты?***

— На тэрыторыі раёна сёння працуюць 226 малых прадпрыемстваў, якія займаюцца менавіта вытворчасцю, і прыкладна паўтары тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў. Падатковыя паступленні ў раённы бюджэт ад прыватнага бізнэсу — на другім месцы пасля прамысловасці. Улада будуе з ім партнёрскія ўзаемаадносіны, адкрыта для прапаноў і дапамагае эфектыўным праектам, якія патрэбны нашаму рэгіёну. Пры гэтым не падзяляем сферы ўплыву, а дапамагаем, дапаўняем адзін аднаго, каб Навагрудчына развівалася і тут было камфортна мясцовым жыхарам, каб нашы маладыя людзі не шукалі лепшай долі за межамі роднага краю.

У даволі вялікім раённым цэнтры павінна быць дзіцячая кавярня? Так. У райвыканкам звярнуўся з прапановай заняцца гэтым пытаннем кіраўнік гандлёвага прадпрыемства «КамРадГандаль» Юрый Радзішэўскі. Ужо рыхтуецца дакументацыя па будаўніцтве гандлёвага аб'екта з дзіцячай кавярняй. А на тэрыторыі Любчанскага пассавета неўзабаве распачне працу новае прадпрыемства: дзякуючы прыватнаму бізнэсу праведзена мадэрнізацыя будынка старой кацельні, дзе будзе выпускацца запатрабаваная прадукцыя — паліўныя брыкеты з выкарыстаннем размешчанага побач радовішча торфу.

Дарэчы, у Навагрудку два даволі буйныя швейныя прадпрыемствы рознай формы ўласнасці. І абодва даволі паспяхова працуюць, бо не перасякаюцца. ААТ «БелКрэда» спецыялізуецца на вырабе мужчынскіх касцюмаў, школьнай формы, а Навагрудская фабрыка спецадзення — на сваім асартыменце.

***— Пабудавалі сучасную жывёлагадоўчую ферму. А кадры?***

— Сапраўды, надзённае пытанне. Сучасныя жывёлагадоўчыя фермы — гэта цяпер адзін з прыярытэтаў у аграрнай сферы. У прыватнасці, неўзабаве будзе здадзены ў эксплуатацыю першы пускавы жывёлагадоўчы комплекс на базе прадпрыемства «Гарадзечна». Грошы ўкладваюцца немалыя (агульны кошт праекта — 54 мільярды рублёў), але гэта, лічу, апраўдана, бо ствараюцца добрыя ўмовы працы для работнікаў і ўтрымання жывёлы, павелічэння колькасці і паляпшэння якасці прадукцыі.

Асноўная праблема ў гэтай сферы — кадравы патэнцыял. Але мы не скардзімся, а стараемся дзейнічаць, каб прыцягнуць маладых спецыялістаў у аграрны сектар. Якім чынам? Летась мы сталі больш цесна супрацоўнічаць з Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэтам. Прычым не проста папрасілі ў яго дапамогі ў забеспячэнні рэгіёна кадрамі, а арганізавалі, так бы мовіць, рэкламную кампанію. Спачатку ўсе кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў на чале з першым наместнікам старшыні райвыканкама пабывалі ў аграрным універсітэце, сустрэліся са студэнтамі і азнаёмілі іх з нашым рэгіёнам, паказалі слайды і відэаматэрыялы. А праз тыдзень накіравалі ў Гродна аўтобус і прывезлі на Навагрудчыну ўсіх, хто зацікавіўся: яны пабывалі ў кожнай гаспадарцы, убачылі, якія там створаны вытворчыя і сацыяльна-бытавыя ўмовы. У выніку да нас прыйшлі 6 маладых спецыялістаў, якія цяпер паспяхова працуюць. Такім чынам зрабілі і сёлета, спадзяёмся, што ў раён прыедуць 3 заатэхнікі і 5 ветурачоў. Мяркую, што толькі так можна вырашаць кадравыя праблемы.

***— Ці з'явіцца «кампанія» ў «першай ластаўкі» ветраэнергетыкі на Навагрудчыне?***

— У Беларусі няшмат пляцовак з належнымі прыродна-кліматычнымі ўмовамі для выкарыстання энергіі ветру. І паколькі першая ветраўстаноўка каля вёскі Грабнікі, побач з Навагрудкам, узведзена прадпрыемствам «Гроднаэнерга», засведчыла апраўданасць інвестыцый, цяпер мы працуем па стварэнні на тэрыторыі раёна ветрапарка. Сёння разглядаюцца розныя варыянты з удзелам айчынных і замежных інвестараў. Ужо ёсць рэальныя прапановы па размяшчэнні на пляцоўцы каля Грабнікаў ветрапарка магутнасцю 20 мегават. Для параўнання: магутнасць пакуль адзінага ветрака — 1,5 мегавата. Акрамя таго, пляцоўка для ветрапарка маецца каля вёскі Валеўка.

**Барыс ПРАКОПЧЫК** ■

■ Прамая лінія

# МЕСЦАЎ СА ШКОДНЫМІ І НЕБЯСПЕЧНЫМІ ЎМОВАМІ ПРАЦЫ СТАНОВІЦЦА МЕНШ

**У анлайн-канферэнцыі «Практычныя пытанні па прымяненні заканадаўства аб ахове працы», якая прайшла на сайтах Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і БЕЛТА, узялі ўдзел наместнік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ, першы наместнік дырэктара Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Аляксандр СЕМІЧ, наместнік начальніка ўпраўлення аховы працы і дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы Мінпрацы і сацыяльнай абароны Ірына КАМЯНЕЦКАЯ.**

***Уладзімір Міхальчук, Салігорск:*** *Які абагульнены партрэт ахвяры надзвычайнага здарэння на вытворчасці (пол, узрост, адукацыя, спецыяльнасць і г.д.)?*

**АЛЯКСАНДР СЕМІЧ:** Гэтае пытанне з'яўляецца некарэктным. Разам з тым аналіз дакументаў спецыяльных расследаванняў няшчасных выпадкаў на вытворчасці са смяротным зыходам, якія адбыліся ў 2011 годзе, паказвае, што за названы перыяд загінуў 181 працаўнік мужчынскага (92,3%) і 15 жаночага полу. Сярэдні ўзрост загінулых склаў 43 гады, а найменшы і найбольшы ўзрост — адпаведна 17 і 73 гады. У 2011 годзе смяротныя траўмы на вытворчасці атрымалі 25 вадзіцеляў аўтамабіляў, 9 падсобных рабочых, 8 жывёлаводаў і па 7 чалавек, якія выконвалі работы па прафесіях трактарыст-машыніст сельскагаспадарчай вытворчасці, грузчык і электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання.

***Марковіч Д.Д., Віцебская вобласць:*** *Добры дзень! Якія самыя распаўсюджаныя прафзахворванні ў Беларусі?*

**ІРЫНА КАМЯНЕЦКАЯ:** У назалагічнай структуры прафзахваральнасці асноўнае месца займае нейрасенсорная глухаватасць — 51 выпадак (41,5%), прафесійны бранхіт — 28 выпадкаў (22,8%), сухоты — 17 выпадкаў (13,8%), пнеўмаканіёзы — 13 выпадкаў (10,6%).

***Марына Філановіч, Мінская вобласць:*** *Якая дынаміка ўзроўню прафесійных захворванняў у апошнія гады і які прагноз на бліжэйшыя гады?*

**АЛЯКСАНДР СЕМІЧ:** У 2011 годзе зарэгістравана 123 выпадкі ўпершыню выяўленых хранічных прафесійных захворванняў, што на 19 выпадкаў больш, чым у 2010 годзе. Паказчык прафесійнай захваральнасці на 100 тыс. работнікаў склаў 2,9 (2010 г. — 1,7).

**По звестках Нацстата, у выніку няшчасных выпадкаў на вытворчасці летась траўмавана 2 тыс. 349 работнікаў, з іх 547 жанчын і 16 работнікаў ва ўзросце да 18 гадоў. У выніку захадаў, якія робяцца па стварэнні бяспечных умоў працы, колькасць пацярпелых на вытворчасці зніжаецца (у 2011 годзе яна скарацілася на 10,1% у параўнанні з 2010-м).**

Пры гэтым за тры апошнія гады 99,2% прафесійных захворванняў прыпадае на хранічныя, якія цягнуць за сабой абмежаванні прафесійнай прыдатнасці і працаздольнасці. Найбольшая колькасць такіх захворванняў зарэгістравана на прадпрыемствах па вытворчасці машын і абсталявання, у металургічнай вытворчасці і вытворчасці гатовых металічных вырабаў, у ахове здароўя і прадастаўленні сацыяльных паслуг, пры здабычы карысных выкапняў, у хімічнай вытворчасці.

***Казелька В.В., Гродзенская вобласць:*** *На ваш погляд, ці трэба ўводзіць на ўсіх прадпрыемствах абавязковыя праверкі работнікаў на алкагольнае ап'яненне? Прычым не толькі раніцай, але і на працягу ўсяго працоўнага дня?*

**ІГАР СТАРАВОЙТАЎ:** Сёння кантроль стану работнікаў прадугледжаны толькі ў дачыненні да вадзіцеляў транспартных сродкаў. У дачыненні да іншых катэгорый работнікаў такое права наймальніку не даецца.

З мэтай аператыўнага выяўлення фактаў знаходжання работнікаў, што працуюць у стане алкагольнага ап'янення (яно часта з'яўляецца прычынай няшчасных выпадкаў на вытворчасці), на заканадаўчым узроўні прапануецца замацаваць норму, якая дае права працадаўцы арганізаваць правядзенне агляду работнікаў на прадмет знаходжання ў стане алкагольнага ап'янення (ці ў стане, выкліканым ужываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў) з выкарыстаннем прыбораў, прызначаных для вызначэння канцэнтрацыі пароў абсалютнага этылавага спірту ў паветры, якое выдыхаецца, і (або) экспрэс-тэстаў. Гэтае права можа быць рэалізавана працадаўцам толькі пры наяўнасці дастатковых падстаў (пах алкаголю з рота, парушэнне маўлення, цяжкасць пры захаванні раўнавагі і інш.)

***Яўген Гракун, Гродзенская вобласць:*** *Ці ўстаноўлена Мінгандлем забарона арганізацыям гандлю і грамадскага харчавання на продаж алкагольных вырабаў асобам у спецадзенні? Якая ваша думка па гэтым пытанні?*

**АЛЯКСАНДР СЕМІЧ:** Першае пытанне трэба адрасаваць Мінгандлю. Разам з тым, паводле наяўнай у Мінпрацы і сацабароны інфармацыі, у цяперашні час такой забароны няма. Варта адзначыць, што нашым міністэрствам неаднаразова ўносіліся прапановы аб мэтазгоднасці ўвядзення забароны продажу алкагольных напояў асобам у спецыяльным ахоўным адзенні.

***Алег Рыжэўскі, Мінск:*** *Якія мае далейшыя дзеянні пасля напісання заявы на скасаванне кантракта з-за парушэнняў яго ўмоў? Начальнік спрабаваў пасля таго, як убачыў гэтую заяву, звольніць мяне па артыкуле, але калі не атрымалася, патрабаваў, каб я напісаў «па пагадненні бакоў». Але трэба пакараць чалавека — з-за таго, як ён сябе паводзіць, звальняюцца сотні людзей з будтрэста... Ён аматар выганяць людзей дадому — сядзець за свой кошт...*

**ІРЫНА КАМЯНЕЦКАЯ:** Датэрміновае скасаванне тэрміновага працоўнага дагавора (кантракта) па ініцыятыве работніка (арт.41 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) за парушэнне заканадаўства аб працы наймальнікам у дачыненні працаўніка магчымае ў тым выпадку, калі факт парушэння заканадаўства ўстановіць спецыяльна ўпаўнаважаны орган. Такіх упаўнаважаных органаў тры: Дэпартамент дзяржаўнай інспекцыі працы Мінпрацы і сацыяльнай абароны Беларусі, прафсаюзы і суд. На гэтай падставе наймальнік мае права, але не абавязак, скасаваць датэрмінова тэрміновы працоўны дагавор (кантракт). У выпадку адмовы скасаваць тэрміновы працоўны дагавор (кантракт) работнік мае права звярнуцца з іскам у суд для прымусу наймальніка на скасаванне дагавора (кантракта).

Што тычыцца пытання «за свой кошт», то такі адпачынак па ініцыятыве наймальніка прадугледжаны арт.191 ПК Рэспублікі Беларусь.

За парушэнне заканадаўства аб працы прадугледжана дысцыплінарная, адміністрацыйная і крымінальная адказнасць (у прыватнасці, арт. 9.19. Кодэкса РБ аб адміністрацыйных правапарушэннях).

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО** ■

*Заканчэнне. Пачатак у нумары за 22 снежня.*

# АНЛАЙН-ТРАНСЛЯЦЫІ З СУДОЎ — У СТУДЭНЦКІХ АЎДЫТОРЫЯХ

**На інтэрнэт-партале гаспадарчых судоў Беларусі не так даўно стартаваў пілотны праект «анлайн-трансляцыя судовых пасяджэнняў». Пра эфект, які чакаецца ад новай формы дзейнасці, перад пачаткам выніковага Пленума журналістам распавёў старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Віктар КАМЯНКОЎ.**

— Ад анлайн-трансляцыі судовых пасяджэнняў мы чакаем высокага эфекту, — адзначыў Віктар Камянкоў. — Яна, па-першае, дысцыплінуе ўсіх удзельнікаў працэсу — бакі, суддзю, сведкаў... Па-другое, гэта рэальная магчымасць кантраляваць усё, што адбываецца падчас пасяджэння. Падкрэслю, мы не дазваляем трансляцыі, калі гэта супярэчыць закону або калі ўдзельнікі працэсу супраць.

Што цікава, назіраць за ходам судовага працэсу на адлегласці змогуць і будучыя суддзі.

— Мы ўжо дамовіліся з некаторымі ВНУ, каб нашы працэсы трансляваліся ў студэнцкіх аўдыторыях. Адна справа падручнікі, іншая — падручнікі плюс нагляднасць. Гэта будзе каласальны эфект, — перакананы старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда. — Даступнасць жа да правасуддзя, да дакладнай і аб'ектыўнай інфармацыі мы гарантуем не толькі праз анлайн-трансляцыі. Наша электронная база ўжо сёння дазваляе карыстацца судовай практыкай. Кожны, хто збіраецца падаваць іск у суд, можа пачытаць судовае рашэнне па канкрэтнай справе, падобнай на яго сітуацыю. І такім чынам прагназаваць, якое рашэнне атрымае па сваёй справе, думаць, ці варта яму звяртацца ў суд, альбо лепш памірыцца?

Набываюць у беларускім судаводстве папулярнасць і судовыя пасяджэнні з выкарыстаннем відэаканферэнцсувязі. Так, сёлета гаспадарчыя суды нашай краіны правялі больш як 1600 такіх пасяджэнняў, у тым ліку і пры разглядзе трансгранічных спрэчак з удзелам суб'ектаў гаспадарання Расіі, Казахстана, Украіны.

**Надзея ДРЫЛА.**

Аліна ТАЛАЙ, лепшая лёгкаатлетка краіны-2012:

# «ГАЛОЎНАЕ Ў ЖЫЦЦІ — ПАСТАЯННАЕ САМАРАЗВІЦЦЁ»

**Прызнанне яе сёлета найлепшай лёгкаатлеткай Беларусі — па-свойму ўнікальны вынік, улічваючы тое, што дзяўчына правяла свой першы «дарослы» сезон. І адразу «бронза» на чэмпіянаце свету, а потым сярэбраны медаль на еўрапейскім першынстве. На сваёй дэбютнай Алімпіядзе спартсменка спатыкнулася ў паўфінале, але ўсё адно лічыць год удалым. Пра гэта, а таксама пра ідэальныя адносіны і жаданне зняцца ў тэлепраекце «Апошні герой» «Звяздзе» распавяла Аліна Талай.**



Фота Надзеі БУЖАН.

## Летні лагер для дарослых

**— Раскажы, як рыхтуешся да Новага года?**

— Шчыра кажучы, гэта суцэльны кашмар. Часу засталося няшмат, але ў галаве яшчэ няма ніякіх думак наконт падарункаў для блізкіх. Вельмі хачу парадаваць сваіх сяброўак і бацькоў, таму, напэўна, прыйдзецца вылучыць цэлы дзень для паходаў па гумах-цумах. Безумоўна, адчуванне нейкага чараўніцтва засталося дзесьці ў дзяцінстве, але і зараз чаканне таго, што ў наступным годзе будзе ўсё па-новаму, надае асаблівы шарм перадсвяточным падрыхтоўкам.

**— Напярэдадні свята падводзіш вынікі года?**

— Гэта я раблю значна раней, калі заканчваецца летні сезон.

**(Заканчэнне на 6-й стар.)**

# ПАД ШЧАСЛІВАЙ ЛІЧБАЙ 100

**Лік нованароджаных у Чачэрску перавысіў сёлета ўжо сотню. Атрымаць пасведчанне аб нараджэнні пад нумарам 100 напрыканцы года выпала маладым бацькам Дзмітрыю і Наталлі Паўленкам, бо гэта іх сынок-першынец Цімафей нарадзіўся пад прыгожай і, трэба спадзявацца, шчаслівай лічбай.**

— Для нас стала нечаканасцю даведацца, што Цімошка нарадзіўся менавіта сотым, — кажуць Дзмітрый і Наталля. — Пра гэта нам паведамілі толькі ў ЗАГСе, калі прыйшлі на рэгістрацыю. Прапанавалі цырымонію ўручэння дакумента зрабіць у прысутнасці родных, сяброў і калег і наладзілі сапраўды прыгожую і нават кранальную ўрачыстасць.

Паўленкі працуюць у раённым аддзеле адукацыі. Дзмітрый узначальвае фізкультурны спартыўны клуб «Ураджай», адказвае за спорт на сяле, у тым ліку і ў навучальных установах. Наталля — метадыст па пачатковых класах і беларускай мове ў школе. Але цяпер у яе законны трохгадовы дэкрэтны водпуск: трэба гадаваць Цімафея, ставіць на ногі. Так што ў маладой сям'і цяпер не менш важная школа — маладых бацькоў.

— Усё робім самі, праўда, не без падказкі старэйшых, — кажуць Наталля і Дзмітрый. — Не адкладваем надоўга хрэсьбіны сына ў царкве.

Сотаму немаўляці Чачэрска выпала прыйсці ў гэты свет сапраўдным багатыром — вагою амаль у 4 кілаграмы і ростам у 56 сантыметраў. Нарадзіўся Цімафей у Гомелі, бо Чачэрскі раддом часова закрыты.



**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «Белспецконтракт» 07 февраля 2013 года проводит 1-ый открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Гусеничное шасси ГТ-МУ из-под РХМ-2С ш. 8904Х0404 дв. 2864 1989 г. 3 кат. 2556 км | г. Старые Дороги, в/ч 42747 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 2 | Гусеничное шасси ГТ-МУ из-под РХМ-2С ш. 8810Х1001 дв. 160614 1988 г. 3 кат. 5357 км | г. Старые Дороги, в/ч 42747 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 3 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ из комплекса К-612-0 ш. 68902006 дв. 8853777 1989 г. 4 кат. 811 км | г. Старые Дороги, в/ч 42747 | 80 000 000 | 8 000 000 |
| 4 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ из комплекса К-612-0 ш. 68902007 дв. 8850408 1989 г. 4 кат. 964 км | г. Старые Дороги, в/ч 42747 | 90 000 000 | 9 000 000 |
| 5 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ из комплекса К-612-0 ш. 68901001 дв. 8846341 1989 г. 4 кат. 893 км | г. Старые Дороги, в/ч 42747 | 90 000 000 | 9 000 000 |
| 6 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ из комплекса К-612-0 ш. 68806005 дв. 8816699 1988 г. 4 кат. 2013 км | г. Старые Дороги, в/ч 42747 | 80 000 000 | 8 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, каб. № 637 **07 февраля 2013 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы **до 17.00 04 февраля 2013 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **07 февраля 2013 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. Без НДС. **Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс (017) 278 09 98. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

# ЛЕДЗЯНЫ ДЗЕД ПАСЯЛІЎСЯ Ў МЯРКУЛАВІЧАХ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Другую зіму запар у вёсцы Мяркулавічы Чачэрскага раёна гасцінна расчыняе вароты рэзідэнцыя Ледзянога Дзеда. Гасцям (а наведваюцца сюды не толькі жыхары гэтага і суседніх з ім раёнаў — Буда-Кашалёўскага, Кармянскага, Гомельскага, але нават з іншых краін — Бранскай вобласці Расіі і Чарнігаўскай вобласці Украіны) паказваюць «ледзяныя» апартаменты, высокі трон-крэсла, каваны жалезны ложак, стосы лістоў ад дзятвы. У адрозненне ад Белавежскага Дзеда Мароза, Мяркулавіцкі Дзед-Лядзяш мае свайго каня, сані і катае наведвальнікаў па куточках вясковага парку.*

■ У прадчуванні

# ПАВІНШУЙ МЯНЕ ПА-БЕЛАРУСКУ

**Традыцыйна перад наступленнем калядных і навагодніх свят нам хочацца павіншаваць блізкіх людзей, калег і проста знаёмых. Як правіла, звычайна віншаванні суправаджаюцца падарункамі, запрашэннямі ў госці і, безумоўна, паштоўкамі. Вялікія і зусім малыя, цацачныя, яркія і, наадварот, вытрыманых, аднатонных колераў — яны суправаджаюць кожнае свята. Без іх сапраўды складана ўявіць віншаванне! А што вы думаеце пра віншавальныя карткі на беларускай мове? Асабіста мне гэта вельмі даспадобы. Таму перад святамі я вырашыла прабегчыся па крамах у пошуку беларускамоўных паштовак.**

**ДЗЕ МОЖНА КУПІЦЬ ПАТРЭБНАЕ?**

У аддзяленнях Белпошты, а яшчэ — у некаторых кніжных крамах. Дарэчы, у апошнія дні даводзілася двойчы забягаць на Галоўпаштамт. Паралельна не магла адмовіць сабе палюбавацца багатай выставай паштовак, якія можна і паглядзець, і набыць — для іх там зроблены цэлы павільён. У першы раз паштовак на беларускай мове там было два стэлажы, менш, чым рускамоўных, але таксама нямала. А вось у другі іх ужо амаль не засталося — можа, толькі нейкіх дзесяць відаў. Касір пацвердзіла — беларускамоўныя паштоўкі бяруць ахвотна, бо прыгожыя.

Калі некаму падабаюцца арыгінальныя «штучкі», то нялішнім будзе заглянуць у крамы, дзе прадаюцца рэчы «хэнд-мэйд». Выбар калядных паштовак там не такі ўжо і вялікі, але затое яны дастаткова арыгінальныя і стыльныя.

Колькі каштуюць? Ад 5 да 20 тысяч, у залежнасці ад якасці. Зробленыя сваімі рукамі — даражэй, стандартныя больш танныя.

**ЯКІЯ ЯНЫ, БЕЛАРУСКАМОЎНЫЯ ПАШТОЎКІ?**

Як звычайна выбіраюць паштоўку? Зразумела, важна, каб яна была прыгожай. Пажадана, каб не залішне стракатай, бо з-за гэтага можна і не разглядзець, што ж за цуд такі на ёй намаляваны. А ў чым асабліваць афармлення віншавальных картак на беларускай мове?

На маю думку, усе беларускамоўныя паштоўкі пад Каляды і Новы год можна падзяліць на тры вялікія «групы» — гэта калі меркаваць па афармленні. Першая група — паштоўкі з сюжэтам нараджэння Ісуса Хрыста. Яны прыгожыя, па-сапраўднаму святочныя, цешаць вока сваёй гарманічнасцю. Другая — паштоўкі з навагоднімі персанажамі — Дзедам Марозам і Снягуркай, аленямі і інш. І трэція — карткі з навагоднімі «атрыбутамі» і інтэр'ерам: калядныя цацкі, прыбраныя ёлкі, заснежаныя домікі...

Што трошкі расчароўвае, вытворцы паштовак на беларускай мове мала клапоцяцца пра разнастайнасць малюнкаў на картках. Так, мала бярэцца ва ўвагу моладзь, якая любіць сюжэты, дзе неяк абыгрываецца каханне, сяброўства ці проста гумар. Шчыра кажучы, я так і не змагла ўбачыць нешта смешнае, сапраўды вясёлае, што б можна было адправіць у канверце сябру ці сяброўцы. А шкада.

**РАЗВІВАЙЦЕ ТВОРЧЫЯ ЗДОЛЬНАСЦІ!**

Чаго не хапае беларускамоўным паштоўкам, дык гэта віншаванняў. Калі паштоўкі на рускай мове можна падзяліць у працэнтных суадносінах прыкладна 50 на 50 з віншаваннямі або без іх (каму што падабаецца), то віншавальныя карткі на роднай мове нічога «не жадаюць» адрасату. Што ж, з іншага боку, гэта развівае творчыя здольнасці. Бо часта толькі беларускамоўнае «З Калядамі і Новым Годам!» падштурхоўвае напісаць у сярэдзіне паштоўкі таксама што-небудзь па-беларуску.

Беларускамоўная паштоўка, нават калі яна не вельмі стыльная (што зробіш, і Рым не адразу будаваўся), — гэта нешта большае, чым звычайная віншавальная картка. Асабіста мне заўсёды прыемна атрымліваць менавіта такія паштоўкі, бо ў іх ужо адразу адчуваецца не проста свята, а яшчэ і сувязь з каранямі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■


## ООО «Арбитр», управляющий по делу о банкротстве – организатор торгов, СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ по продаже имущества Волковысского ОАО «ПМК-Строй»:

| № лота | Наименование лота | Начальная цена продажи лота | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Двухэтажный административный корпус S 242 м², ж/б забор L-239,12 м, с воротами, водопроводная, канализационная и тепловая сети, кабельная электролиния, дворовое покрытие S 282,5 м² | 208 623 516 р. | 10 431 176 р. | 10 431 176 р. |
| 2 | Столярный цех и мехмастерская S 547 м², котельная и котел КВ-95 | 227 815 875 р. | 11 390 794 р. | 11 390 794 р. |
| 3 | Одноэтажное кирпичное здание бытовка-склад, S 119,1 м² | 47 623 634 р. | 2 381 182 р. | 2 381 182 р. |
| 4 | Одноэтажное кирпичное здание складов S 446,8 м², кирпичной уборной и кирпичным сараем S 4,4 м² | 170 329 500 р. | 8 516 475 р. | 8 516 475 р. |
| 5 | Пилорама (3А1/к) | 29 845 981 р. | 1 492 299 р. | 1 492 299 р. |
| 6 | Растворобетонный узел (2А1/к) | 28 298 531 р. | 1 414 927 р. | 1 414 927 р. |
| 7 | Растворобетонный узел (6А1/к) | 52 456 359 р. | 2 622 818 р. | 2 622 818 р. |

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

**Торги состоятся 14 января 2013 года в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5.**

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: Волковысское ОАО «ПМК-Строй», р/с 3012202200013 в ОАО «Белагропромбанк» отделение в г. Волковыск, код 152101446, УНП 500042773.

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления **до 11.00 13.01.2013** по адресу: 230001, г. Гродно-1, а/я 27 или по факсу 8(0152) 526859.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. В соответствии с п. 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Настоящее объявление содержит лишь общие характеристики предмета торгов и условий его реализации. Получить полную информацию о порядке и условиях проведения торгов, о предмете торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5, тел. 8(029)7831160, тел./факс 8(0152)526859. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Октябрьская, д. 151.

БЕЛАРУСБАНК 90 лет

## Публичная оферта (предложение) о начислении поощрительного дополнительного процентного дохода по срочным банковским вкладам в белорусских рублях

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 1 января 2013 года поощрительный дополнительный процентный доход по следующим срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:

- **«Классик плюс», «Сберегательный», «Ваш выбор»** (вне зависимости от ежедневного остатка вклада) – в размере **9% годовых**;

- «**Накопительный», Премиально-накопительный «Детский», «Новый 2010»** – в размере **7% годовых**.

Начисление поощрительного дополнительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 01.01.2013 или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по 30.01.2013 (включительно), исходя из количества дней, установленных условиями конкретного вида вклада, для начисления процентного дохода.

Присоединение к остатку вклада поощрительного дополнительного процентного дохода производится 31.01.2013.

При этом поощрительный дополнительный процентный доход не выплачивается:

- в случае если в период с 01.01.2013 по 30.01.2013 (включительно) совершается возврат вкладчику суммы вклада (в том числе вкладов, срок возврата которых наступил в указанный период января 2013 года) или расходная операция, влекущая перерасчет причитающегося по вкладу дохода, или первая расходная операция на основании свидетельства о праве на наследство;

- в случае если на 01.01.2013 по вкладу начисляется пониженная процентная ставка или доход по вкладу начисляется в размере ставки вклада до востребования (в том числе по вкладам «Сберегательный» и «Новый 2010», срок возврата которых наступил до 01.01.2013).

Начисление дохода на сумму поощрительного дополнительного процентного дохода производится с 31.01.2013.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком поощрительного дополнительного процентного дохода.

**Более подробную информацию можно получить в отделениях банка, в Контакт-центре по телефону 147 и на сайте www.belarusbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ПЧУП «Сморгонский комбинат хлебопродуктов» УНН 590336480

## ПРОВОДИТ ЗАКУПКУ НА КОМПЛЕКТ ОБОРУДОВАНИЯ ДЛЯ РЕКОНСТРУКЦИИ КРУПЯНОГО ЦЕХА.

За интересующей вас информацией обращаться по тел./факс **(8 01592) 32 616** или на официальный сайт **www.icetrade.by.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ

УНП 100071325

**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»**

доводит до сведения дольщиков

О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ о строительстве нежилых помещений объекта «Жилой дом № 5 (по генплану) со встроенными помещениями по пр. Независимости в микрорайоне Уручье-3» в г. Минске, опубликованную в газете «Вечерний Минск» 14 декабря 2009 года:

**Ожидаемый ввод нежилого помещения № 1 в эксплуатацию – 31 декабря 2012 г.**

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*

## ИЗВЕЩЕНИЕ

УНП 100071325

**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»**

доводит до сведения дольщиков

О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ о строительстве нежилых помещений объекта «Жилой дом № 5 (по генплану) со встроенными помещениями по пр. Независимости в микрорайоне Уручье-3» в г. Минске, опубликованную в газете «Рэспубліка» 3 сентября 2008 года:

**Ожидаемый ввод нежилых помещений № 2 и № 3 в эксплуатацию – 31 декабря 2012 г.**

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*

## Извещение об открытом аукционе по продаже объекта недвижимости

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Начальная цена (руб.) с учетом НДС | Сумма задатка (руб.) | Условия продажи | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Капитальное строение, инв. № 400/С-76345 (здание свинарника) | Гродненский р-н, г.п. Сопоцкин, ул. Яна Павла II, 70А | 163 545 600 | 16 000 000 | Продажа в собственность | Одноэтажное кирпичное здание общей площадью 404,3 кв.м, площадь застройки 472 кв.м, год постройки 1984, забор, ворота – 2 шт, колодец. Площадь земельного участка – 0,2036 га |

Лот продается по договору поручения. Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в ф-ле 400 в Гродненском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

3) Победитель аукциона обязан в течение 10 календарных дней с момента подписания протокола аукциона заключить договор купли-продажи.

4) Оплата за объект производится в течение 15 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи.

**Аукцион состоится 30 января 2013 года в 16.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. № 61 в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. **Заявления принимаются с 3 января по 24 января 2013 г.** Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## ОАО «БАРАНОВИЧИДРЕВ»

**уведомляет своих акционеров о проведении 29 января 2013 года внеочередного общего собрания акционеров.**

**Повестка дня:**

**1. Переизбрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Барановичидрев».**

**Собрание состоится по адресу: г. Барановичи, пос. Восточный, 3, актовый зал заводоуправления ОАО «Барановичидрев». Начало в 12.00.**

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни в период с 18 января 2013 года — с 9.00 до 15.00 (перерыв с 12.30 до 13.30) в здании заводоуправления, кабинет 10, а в день проведения собрания — в месте проведения собрания с 11.00. Регистрация участников собрания будет проводиться с 11 часов до 11 часов 50 минут по месту проведения собрания при предъявлении документов, удостоверяющих личность.

УНП 200299909

## ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»

220013, город Минск, ул. П. Бровки, 8

**ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Собрание состоится 10 января 2013 г. в 15.00 по адресу: 220013, город Минск, ул. П. Бровки, 8, актовый зал Общества.**

**Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.45.**

**Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в собрании, – 28 декабря 2012 г.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об утверждении результатов открытой продажи акций Общества.
2. Об утверждении решения о выпуске акций Общества.
3. Об увеличении уставного фонда Общества.
4. О внесении изменений и дополнений в устав Общества.

Основание созыва собрания – решение Совета директоров Общества от 27 декабря 2012 года.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 5 января 2013 г. в юридическом управлении Общества (г. Минск, ул. П. Бровки, 8) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (личный паспорт, для представителя акционера – доверенность или договор).

*Совет директоров ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга».*

УНП 100135676.

## Извещение об открытом аукционе по продаже права аренды изолированных помещений и зданий в г. Гродно

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь (кв.м) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Условия аукциона | Характеристика объекта и условия использования |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Академическая, 14 | 18,2 | 250 000 | 25 000 | Аукцион без условий | 2-й этаж в двухэтажном здании |
| 2. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Карбышева, 22 | 17,4 | 240 000 | 24 000 | Аукцион без условий | Цокольный этаж |
| 3. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Советская, 6-1 | 29,0 | 400 000 | 40 000 | Аукцион без условий | 1-й этаж в двухэтажном здании |
| 4. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Советская, 7-13 | 26,4 | 360 000 | 36 000 | Аукцион без условий | 2-й этаж в двухэтажном здании |
| 5. | Право аренды помещения на 3 года | Ул. Советская, 5-7 | 48,0 | 650 000 | 65 000 | Аукцион без условий | 2-й этаж в двухэтажном здании |
| 6. | Право аренды помещения на 3 года | пр-т Клецкова, 106 | 42,0 | 570 000 | 57 000 | Аукцион с условием* | Мансардный этаж в жилом доме |
| 7. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Комарова, 6 | 30,5 | 420 000 | 42 000 | Аукцион без условий | 1-й этаж в здании общежития |
| 8. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Комарова, 8 | 190,0 | 2 565 000 | 256 500 | Аукцион с условием** | 2-й этаж в здании общежития |
| 9. | Право аренды помещения на 3 года | ул. К. Маркса, 5-6 | 37,7 | 510 000 | 51 000 | Аукцион без условий | 2-й этаж в двухэтажном здании |
| 10. | Право аренды помещения на 3 года | ул. К. Маркса, 7-6 | 29,9 | 410 000 | 41 000 | Аукцион без условий | 1-й этаж в двухэтажном здании |
| 11. | Право аренды помещения на 3 года | ул. К. Маркса, 7-9 | 37,2 | 510 000 | 51 000 | Аукцион без условий | 2-й этаж в двухэтажном здании |
| 12. | Право аренды помещения на 3 года | ул. К. Маркса, 9а-3 | 39,3 | 540 000 | 54 000 | Аукцион без условий | 1-й этаж в двухэтажном здании |
| 13. | Право аренды здания на 3 года | ул. Горновых, 29 | 44,6 | 610 000 | 61 000 | Аукцион с условием*** | Одноэтажное здание |
| 14. | Право аренды здания на 3 года | ул. Щорса, 41 | 30,0 | 405 000 | 40 500 | Аукцион без условий | Одноэтажное здание |
| 15. | Право аренды здания на 3 года | ул. Горького, 71 | 15,8 | 215 000 | 21 500 | Аукцион без условий | Гараж |

**Использование объекта по согласованию с МЧС и ГУ «ГЗЦГиЭ», ** обустройство отдельного входа, *** досрочное расторжение договора аренды в случае сноса объекта.*

Коэффициент, устанавливаемый арендодателем, равен 1.

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости» При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в ф-ле 400 в Гродненском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 199, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за право заключения договора аренды осуществляется по безналичному расчету в течение 3-х рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.

3) Победитель аукциона в течение 3-ти рабочих дней с момента подписания протокола аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

**Аукцион состоится 30 января 2013 года в 16.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. № 61 в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. **Заявления принимаются с 3 января по 24 января 2013 г.** Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## ОАО «Амкодор-Унимод»

220073, город Минск, ул. Пинская,18

**ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Собрание состоится 9 января 2013 г. в 15.00 по адресу: 220073, город Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал Общества.**

**Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.45.**

**Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в собрании, – 28 декабря 2012 г.**

**Повестка дня:**

1. Об утверждении результатов открытой продажи акций Общества.
2. Об утверждении решения о выпуске акций Общества.
3. Об увеличении уставного фонда Общества.
4. О внесении изменений и дополнений в устав Общества и утверждении его в новой редакции.

Основание созыва собрания – решение Совета директоров Общества от 27 декабря 2012 года.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 4 января 2013 г. в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (личный паспорт, для представителя акционера – доверенность или договор).

УНП 100010116. *Совет директоров ОАО «Амкодор-Унимод».*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона), по поручению Логойского райпо (продавец), проводит открытый аукцион по продаже**

**здания магазина № 7,**

**инвентарный номер: 601/С-13258, об.пл. 98,8 кв.м, расположенного по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Острошицкий с/с, д. Бояры, ул. Центральная, д. 12.**

**Начальная цена с НДС – 123 600 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,0851 га** (предоставлен продавцу для обслуживания здания магазина № 7 на праве постоянного пользования. Ограничения в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт, площадь 0,0050 га).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **5** (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение **10** (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **29.01.2013** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, офис 5. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.01.2013** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел: +375 17 280 36 37.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ 2-Х ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛЫХ ДОМОВ

**Организатор аукциона — Жемчужненский сельский исполнительный комитет Барановичского района Брестской области**

| № п/п | Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка | Характеристика инженерных коммуникаций | Площадь земельного участка, га | Назначение участка | Начальная цена объекта, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Жемчужненский с/с, аг. Жемчужный, ул. Озёрная, 5, кадастровый номер 120481503601000416. Рядом лес, озеро | Участок свободен от застройки. В радиусе 200 м водопровод, газопровод, линия электропередач | 0,1659 | для строительства и обслуживания жилого дома | 10059180 | 1005918 | 1714414 + расходы на размещение информации в СМИ |
| 2 | Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Жемчужненский с/с, аг. Жемчужный, ул. Озёрная, 8, кадастровый номер 120481503601000343 | Участок свободен от застройки. К участку существует возможность подвода сетей: водопровода, газопровода, имеется линия электропередач | 0,1556 | для строительства и обслуживания жилого дома | 19738961 | 1973896 | 275000 + расходы на размещение информации в СМИ |

1. Аукцион состоится **14 февраля 2013 года в 15.00** в здании Жемчужненского сельисполкома по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, аг. Жемчужный, ул. Ленина, 25.

2. Условия аукциона:

- наличие не менее двух участников.

3. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории РБ или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 10%.

5. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;

- копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица;

- доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет **до 11 февраля 2013 года до 17.00** на расчетный счет 3604211050007, фил. 802, ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, УНП 200046491.

Адрес банка: Брестская область, г. Барановичи, б-р Штоккерау, д. 8 а.

Получатель: Жемчужненский сельский исполнительный комитет, 225316, Брестская область, Барановичский район, пос. Жемчужный, ул. Ленина, 25.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

7. Победитель аукциона обязан: оплатить в течение 10 дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка стоимость объекта продажи и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, по оформлению государственной регистрации создания земельного участка, а также затраты, связанные с размещением извещения о проведения аукциона в средствах массовой информации.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи:

каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по телефонам (8 0163) 43 16 35, 43 01 36.

9. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

10. Покупатель, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере 10% от начальной стоимости по каждому земельному участку.

11. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни **с 14 января 2013 года в комиссии с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** в Жемчужненском сельисполкоме. Последний день приема документов — 11 февраля 2013 года до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона — **14 февраля 2013 года с 14.00 до 15.00.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

12. Участник, ставший победителем аукциона, либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему данного земельного участка, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; внести плату за земельный участок; не позднее 2 месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона осуществить государственную регистрацию права за земельный участок.

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «ТУРИСТИЧЕСКИЙ КОМПЛЕКС «БРЕСТ-ИНТУРИСТ»

| Номер лота | ЛОТ № 1 |
|---|---|
| Наименование объекта | Капитальное строение (инв. № 100/С-4080) – ангар, здание специализированное розничной торговли, наименование – торговый центр «Ваш выбор», общ. пл. 910,4 м² |
| Местонахождение объекта | г. Брест, ул. 17 Сентября, 49 |
| Начальная цена продажи, руб. без НДС | 5 561 060 000 |
| Размер задатка, руб. | 556 106 000 |
| Право на земельный участок | Право постоянного пользования |
| | 0,1322 га |
| Условия продажи | без условий |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Туристический комплекс «Брест-Интурист» |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Условия оплаты | Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012356260016 руб. РБ в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) РД № 500 г. Минск, ул. Московская, д. 14, код 153001108, УНП200019786 |

**Аукцион состоится 09 января 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Филиал «Центр «Белтехинвентаризация».**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**

**Последний день приема заявлений – 08 января 2013 г. до 17.00.**

**Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**

## ■ Мая праўда



*Вельмі рэдкі чалавек не любіць Новы год. Для большасці гэта — адно з самых лепшых, радасных свят. Нават стаўшы дарослымі, мы з лёгкасцю прыгадаем, у якім касцюме былі на навагоднім ранішніку ў дзіцячым садку ці школе. Ці як чакалі Дзеда Мароза з яго падарункамі, нават калі адчувалі, што ён неяк вельмі падазрона нагадвае бацьку... Памятаем пах навагодняга дрэва, пра якое і праз паўгода пасля свята нагадвалі выпадкова знойдзеныя іголкі хвоі... Іншая справа, што адзначаць Новы год можна па-рознаму, асабліва цяпер, калі з'явілася столькі магчымасцяў. Хочаш — у цёплую краіну едзь да мора-акіяна. Хочаш — на гарналыжны курорт у паўночную. Гатаваць самому зараз неабавязкова: хапае рэстаранаў-кавярняў на любы густ і кішэню. А можна і проста ў госці выправіцца. Карацей кажучы, варыянтаў процьма. Дык як лепш адзначаць свята?*

*Сёння на тэму сустрэчы Новага паспрачаліся прыхільнік традыцый і аматарка навамодных тэндэнцый.*



# НЕ ЗДРАДЖВАЦЬ ТРАДЫЦЫЯМ!

**Кожны год я прашу сваю маці, каб яна не рабіла да навагодняга стала заліўную рыбу. Тая пагаджаецца, ківае галавой, а потым, як правіла, выстаўляе гэтую страву пад бой курантаў. Не, не падумайце, барані Божа, што тая заліўная рыба — гадасць, як казаў герой аднаго вядомага фільма. Зусім наадварот, і заліўную рыбу я вельмі люблю і паважаю. Проста мне шкада намаганняў маці, бо тую страву элементарна няма дзе паставіць на стале з-за... адсутнасці месца. Пір жа, як кажуць, гарой!**

...Мая пакуль не ўвасобленая ў жыццё мара: напрыканцы адыходнага года мы з братам, ухілюўшы ўвечары пражэктар, гатуем пад нашай такой любімай усімі летам альчой-шатром вялікі кацёл юшкі. А побач на мангале шкварчаць, распаўсюджваючы ў марозным зімовым паветры (ад чаго так нясцерпна казыча ў носе) водар, шашлыкі... І калі ўсё амаль гатова, мы завём да жывога агню нашых жанчын... Не атрымліваецца пакуль тая мара: то дождж за каўнер залівае на Новы год, то завея перашкаджае, то проста элементарна не хапае часу на падрыхтоўку. Але, галоўнае, нашы жанчыны... Маці выразна святочнага меню пачынае прадумваць, лічы, як праца на агародзе скончылі ўвосень. Нешта закупляе, выдумляе-рыхтуе... Жонка ж таксама павінна паказаць, што мамчын сыночак не абы-каму дастаўся, значыць, яе варыянт святочнага меню таксама «абстрэкцыя» не падлягае. «Сказала, прыгатую — значыць, прыгатую!» Пра цешчыны піражкі ці якую іншую смакату ўжо прамаўчу... Ну, і хлопцы, вядома, таксама не дурні. Гэтак жа рыхтуюцца. Толькі... па «сваёй» частцы. Вось і атрымліваецца ў выніку той самы пір, які — гарой!

**пазней сышліся на думцы, што менавіта гэтых, такіх звыклых перадсвяточных клопатаў — нашынкаваць славуты тазік «аліўе» — нам і не хапіла**

...Бульба — у любым выглядзе, але (для мяне!) абавязкова. Курыца, фаршыраваная блінамі. Мяса «па-французску». Згаданая фаршыраваная рыба або рыба смажаная. Вэнджаная — асобна. Вядома, бутэрброды з чырвонай рыбай. Ну, ці там — з ікрой. Запечаныя тосты — не абмяркоўваецца. Грыбы вітаюцца любыя і ў любым выглядзе! Селядзец пад «шубай»... А халадзец з хрэнам?.. Палянядзіца, каўбаска — «пальцам пханая» (гэтак жа слінай папярхнуцца можна, праўда?)... Гурочкі хрусткія — са свайго агарода. Памідорчыкі, вядомая рэч, як жа без іх. Ну, пра розныя ананасы-мандарыны-апельсіны маўчу. Свята ж! А, салодкае яшчэ... Проста я не аматар. Пасля вышэйпералічанага...

Натуральна, не кожны год і не ўсё адразу з вышэйзгаданага прысутнічае на нашым святочным сямейным навагоднім стале. Але ж тэндэнцыю ўлавілі? Уласна, усё — як у большасці беларусаў. Гатуецца гэтая смаката напярэдадні ўсімі сямейнікамі разам. Нехта бульбу абірае, хтосьці яйкі для «мімозы» ачышчае... Працэс доўгі, займае практычна ўвесь дзень. К вечару ўсе некалькі, як правіла, стамляюцца, але падбадзёрваюць жартам адно аднаго, што, маўляў, бліжэйшым днём гатаваць увогуле не давядзецца...

Ці надакучвае такая падрыхтоўка? Вось вам прыклад з жыцця. Аднойчы мы з жонкай так і пастанавілі — хопіць, маўляў! Ды і нагода была — надыход трэцяга тысячагоддзя, мілленіума, калі хто ўжо забыўся. Ну, і паехалі сустракаць Новы год (Сільвестр па-тамтэйшаму) за мяжу. Святкаваць планавалася ў шыкоўным рэстаране мясцовага атэля «Хілтан», як мы яго празвалі. Ну, вось, сядзім сабе ў нумары, нічога рабіць не трэба — чакаем! Чакаем, чакаем, калі нас на гатовае свята запросяць... І тут я лаўлю сябе на думцы, што нечага быццам бы не хапае... І нумар атэльны ўтульны, і тэлевізар працуе, і піва замежнае халоднае-смачнае... Усё выдатна, але ж... Ды і жонка (прыглядаюся цішком, бо памятаю «колькі можна, мы што, не маем права?») таксама нешта сабе думае... Карацей, пазней сышліся на думцы, што менавіта гэтых, такіх звыклых перадсвяточных клопатаў — нашынкаваць славуты тазік «аліўе» — нам і не хапіла. Разумення прыйшло пазней, пасля сустрэчы Новага года. Цікава было, весела, смачна, але... неяк не па-нашаму.

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што ў многіх краінах у большай пашане — Каляды, якія лічацца сямейным святам. Новы год там так шырока не адзначаюць. І вось замовілі мы нешта паесці, выпіць... Побач мясцовыя жыхары адзначаюць — цягнуць-пацягнуць свой келіх шампанскага за, у нашым уяўленні, вельмі сціпла сервіраваным столікамі... А нашы турысты — спачатку тост за сустрэчу Новага года па расійскім часе, потым па беларускім, напрыканцы — па мясцовым! Весела, шумна, танцы... Не паспелі азірнуцца, а на талерках — пуста. Падспраўвалі яшчэ нешта замовіць, а кухня ўжо зачынена. Гляджу, нашы запаслівыя жанчынкі давай з пакетаў прыхопленую «на ўсялякі выпадак» з дому вэнджаную каўбаску даставаць, мужчыны — вадкае «палівa»... Можна, вядома, і пасмяяцца з таго: маўляў, не хапіла? Так, не хапіла — той атмасферы, якая звычайна пануе за нашымі навагоднімі сталамі дома.

Вось сказаць колькі слоў пра той жа салат «аліўе». Дагэтуль нехта лічыць яго ці не сімвалам нейкага мяшчанства, дрэннага густу. Быў такі перыяд, калі гэты салат сапраўды надакучыў. Памятаеце, тады многія замянялі яго навінкай: з салодкай дэсертнай кукурузай, крабавымі палачкамі і рысам? А прайшло гадоў пяць, і адночы мы адчулі, што нечага не хапае. Нейкага сімвалу свята нароўні з мандарынамі, шампанскім, заліўной рыбай і вядомага фільма, адкуль і пайшла гэтая фраза. А каму не падабаецца «класічны» савецкі варыянт, раю замест варанай каўбасы дадаваць добрую вяндліну, а гурок увогуле не класці — у любым выглядзе. І абавязкова пасыпаць страву чорным молатым перцам. Смаката!...

...Адкуль пайшла традыцыя, каб стол на навагоднім свяце быў застаўлены самымі разнастайнымі прысмакамі? Як мне падаецца, з савецкіх часоў — пары татальнага дэфіцыту. Памятаеце, як тады жартавалі: «У крамах пуста, а на стале — густа»? Калі трапляліся якія прадукты, іх беражліва адкладвалі на свята. Шчасцем было атрымаць набор прадуктаў з тагачасных «сталоў заказаў» (згодна са статусам атрымальніка!). І слоік таго ж кансерванага гарошку, бляшанку шпротаў ці кавы, палку «сухой» каўбасы пакідалі якраз на свята. На стале вялікіх кулінарных вытанчанасцяў па той прычыне не было: селядзец пад адваранную бульбу, вінегрэт, бутэрброды са шпротамі, хатнія катлеты... Густы з цягам часу змяніліся, звычайныя прадукты перасталі быць дэфіцытам, больш за тое — у нас з'явілася магчымасць дазволіць сабе тое, чаго мы сабе раней і ўявіць не маглі. А вось гэтая традыцыя — загадзя рыхтавацца да зімовага свята — засталася. І мне яна падабаецца! Найперш тым, што яднае ўсіх родных: напачатку агульнай падрыхтоўкай (невыпадкова ж кажуць, што прадчуванне свята больш прыемнае за яго самога), а потым — за адным агульным сталом ва ўтульнай цёплай хаце. Таму — пад пах мандарынаў і хвоі і пад звон бакалаў — за наш любімы «аліўе»! Каб і на наступны год было гэтак жа!

**P.S.** Крыху адпачнём і — з новымі сіламі — адзначым Каляды. А потым — «стары» Новы год. А, яшчэ не забыцца пра канец свету па старым стылі. Традыцыя!..

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# АХ, НЕ ПРАПІЦЕ СВЯТА!

**Апошнія гадоў дзесяць у гэты час у нашай сям'і разгараецца адна і тая ж дыскусія. Дык гатаваць адно, другое, дваццаць пятае або так пасядзіць, з мандарынкамі?.. Прычым дыскутую з блізкімі толькі я, бо я адна — за мандарынкі. Ну, у мяне свая логіка (пэўна, бландзінкі). Звычайна зімой я прыбаўляю ў вазе. Не, не таму што забываюся на здаровы лад жыцця. Проста якраз цудоўна ведаю, што, згодна са здаровым ладам жыцця, худзець у халодны час года нельга: абавязкова будзеш хварэць. Імунітэт мае патрэбу ў большай колькасці не толькі вітамінак, але і тлустай ежы. Акрамя таго, тутэйшыя ўмовы надвор'я робяць айчынныя дарогі абсалютна непрыдатнымі для прагулак, і асабіста мяне — істотна абмяжоўваюць у руху — вулічным руху.**

Словам, да святкавання Новага года я падыходжу з розумам! Напярэдадні пад'ядаю запасы цукерак, дазваляю сабе самую смачную каўбаску і г.д. А 30-31-га кажу сабе: «Стоп-стоп-стоп». Ну і навакольным кажу тое ж самае: «А давайце наладзім разгрузачныя дні!» «Ну, ты разгружайся, — чую ў адказ, — а нам — забяспеч!» І спакойна працягваюць мне ў рукі доўгія спісы прадуктаў для паходу па магазінах (проста я лепш за ўсіх набываю прадукты!). Ох... Яшчэ ніводнага разу мне не ўдалося перацягнуць каго-небудзь на свой бок.

Так ці інакш... Даводзіцца набываць, мыць, чысціць, рэзаць, варыць, смажыць, запякаць, раскладваць, заліваць, настойваць, адкрываць, змешваць... Ну, а потым з сумным тварам кемарыць за агульным сталом, дзе, здавалася б, бясконцыя аб'ёмы ежы даволі хутка... заканчваюцца. А самае жудаснае, што на наступны дзень пасля гэтага здзеку з арганізма ўсе зноў... галодныя! Ідзі, маўляў, падрэж таго-сяго... А салаціку не засталося? Што, і буцікі ўчора з'елі? Угу, учора вы б і мяне з'елі, калі я б адным вокам за вамі не назірала...

Вядома, калі я была адной нагой у дзяцінстве, то інакш глядзела на прысмакі. Ну, проста тады быў іншы час. Савецкі. Дэфіцытны. Галодны. Пайдзі ты, пабегай галодны 364 дні запар! Што называецца, увесь час у стане «сярэдзінка сытая, а канцы гуляюць». Зразумела, што хоць бы раз на год — на Новы год — можна і разабрацца з канцамі! Усе савецкія людзі адну ноч у годзе былі падобныя на людзей — з ежай, выпіўкай, і ўсёй сям'ёй. Бо гэта адно з лічаных свят, калі свята — ва ўсіх і кожнага!

Салаты «Аліўе», «Зімовы», «Мімоза», шуба, бульба з курыцай, нарэзачка, рыбка і такая, і гэткая, яйкі, фаршыраваныя грыбкамі, тысяча і адна «закатка», у некага — бутэрброды з ікоркай... А яшчэ торт, прыгатаваны ўласнымі ручкамі, мора цукерак і фрукты — каму якія пашчасціла раздабыць. І ўсё гэта ў той колькасці, якая не лезе ў халадзільнік, але ўмяшчаецца ў страўніку. Што характэрна, яшчэ ў працэсе падрыхтоўкі ўсяго ядомага сям'я неаднойчы на працягу дня паспявае няблага «замарыць чарвячка», каб ацаніць, ці смачна атрымліваецца.

Ежа, як вядома, — адно з самых даступных задавальненняў. Нават калі яна нятанная. У заможных краінах такая радасць была даступная ў любы дзень і гадзіну. Аднак калі будуеш камунізм, то... Савецкі чалавек не меў магчымасці ездзіць у адпачынак, рабіць рамонт, мяняць (!) норкавыя шубкі... Ён не мог нават проста прыйсці ў магазін і купіць. Проста купіць! Не тое, што яму падабаецца, а хоць бы што-небудзь... Патрэбны быў блат. Дык вось раз на год здараўся цуд: блат адшукваўся ва ўсіх! І металічныя тазікі маглі сабе дазволіць ламіцца ад «Аліўе»...

Штосьці ў гэтым было... Мітусня вакол гаспадыні, смачныя пахі... Выцягванне са старых шаф посуду «для гасцей»... Поўны стол — як магчымасць аддзячыць сабе за гадавы працоўны подзвіг і як натхненне на наступныя 364 дні. Акрамя таго, у нашым жыцці было так мала... ой, ды што там наогул было? Гэта цяпер — і Сілічы, і Раўбічы, і Свіслач, і Нарач... І вясковыя сядзібы... І Літва, Польшча, Чэхія, Германія... І Егіпет з Кіпрам — на крайні выпадак... А тады? Уся радасць і была ў тым, каб ад'есціся пад моцнаградуснае суправаджэнне. Каб было што абмеркаваць пасля!

Сёння ўсё, што мы можам паставіць на навагодні стол, даступнае нам у любы дзень. Ежы хапае. І выпіўкі таксама. Хочацца... свята! Эмоцый! Яшчэ, дарэчы, не цікавілася, што там сёлета прапануюць гарадскія ўлады ў гэтыя дні, але дзякуючы «Фэйсбуку» ведаю, што ў нашых суседзяў, напрыклад, у межах гарадскога навагодняга фестывалю 15 маскоўскіх паркаў з 30 снежня па 8 студзеня будуць насіць назвы кшталту Аліўе, Мандарын і Ілюзія, што будзе адлюстроўваць сутнасць іх навагодніх праграм. Па вечарах у парках можна будзе пабачыць выступленне французскага вулічнага тэатра Quidams. Навагодняя ноч будзе адзначана музыкай і феерверкамі. Дарэчы, у кожнай маскоўскай акрузе феерверк будзе мець свой колер! Ах, не прапіце свята!

З другога боку, калі стол — не адмяніць (як у выпадку з маёй раднёй), то паспрабуйце накрыць яго згодна з правіламі змяншэння каларыйнасці страў.

1. Хлеб — з мукі грубага памолу. Або хлябцы.

2. Дадавайце алей у невялікай колькасці і напрыканцы гатоўкі.

3. Прыгатуйце бульбяное пюрэ без сметанковага масла.

4. Зменшыце порцыю мяса (зрабіце катлеты з нятлустай курыцы або ялавічыны, з дабаўленнем пакрышаных грыбоў, запякайце ў духоўцы).

5. Разбаўляйце сок з мінеральнай вадой 1:1, або піце зялёны чай, негазаваную ваду.

6. Прыгатуйце лёгкі дэсерт, а лепш з'ешце свой кавалак пірага на наступны дзень.

7. Не спрабуйце пакаштаваць усё, што бачаць вочы.

А вось «Аліўе» прыгатуйце па рэцэпце адной расійскай «зоркі». Вам спатрэбяцца: 3 бульбіны, 1 морква, 2 яйкі, 2 марынаваныя агуркі, 150 г зялёнага гарошку, 200 г нятлустай варанай ялавічыны, 1 сочны яблык, 1 рэпчатая цыбуліна, 250 г тлустай смятаны, зяленіва пятрушкі і кропу.

А наогул сустракайце Новы год... так, як хочацца! Галоўнае, каб гэта было!

Калі я была студэнткай, давялося сустракаць Новы год адной. Толькі я і тэлевізар. На стале — мандарынкі з цукеркамі. Запаліла свечку, загадала жаданне (без шампанскага, вядома)... Свечка была, відаць, не надта якасная і моцна расцяклася па сурвэтцы... Раніцай я разгледзела ў тым, што засталося ад свечкі, прыгожае... сэрца. Я не жартую. Блізкія не дадуць схлусіць. Год, як вы разумееце, выдаўся знакавым па частцы пачуццяў. Гэта так, да слова...

**Святлана БАРЫСЕНКА**

## ■ Факт

### У знакамітых азёр свой слоган і лагатып



**У Браслаўскім райвыканкаме робяць стаўку на прыдуманыя і зацверджаныя слоган і лагатып гэтага азёрнага краю, якія паспрыяюць павелічэнню колькасці турыстаў.**

Раней у гэтага раёна, добра вядомага далёка за межамі Беларусі, як ні дзіўна, не было свайго «сімвала». Недахоп вырашылі ліквідаваць у выніку конкурсу, узяць удзел у якім запрасілі землякоў. Ды і госці раёна пры жаданні маглі паспрабаваць сябе ў ролі мастакоў-дызайнераў і крэатыўшчыкаў, каб урэшце быў створаны аўтэнтычны лагатып.

Таму райвыканкам аб'явіў конкурс творчых работ па стварэнні эмблемы і слогана Браслаўшчыны як турыстычнага рэгіёна. Жыхары раёна вельмі ахвотна і актыўна адгукнуліся на гэты заклік.

Пасля ў райвыканкаме вырашылі, што з выкананнем пастаўленай задачы лепш за астатніх справіўся педагог дадатковай адукацыі раённага цэнтра дзяцей і моладзі Міхаіл Ставіцкі. Ён улічыў пажаданні членаў нефармальнага журы. Былі распрацаваны слоган і лагатып — вынік калектыўнай «інтэлектуальнай атакі» многіх жыхароў раёна.

У лагатыпе (маляўнічай эмблеме) сімвалізаваны раслінны свет краю азёр, вада і нябёсы, сонца і пясок. На эмблеме адразу можна распазнаць азёрныя хвалі і ўзгорысты рэльеф краю. Слоган — «Браслаўскія азёры: у адпачынку ёсць імя».

Лагатып і слоган будуць выкарыстоўвацца на рэкламнай прадукцыі, упрыгожваць сувеніры, распаўсюджвацца ў сродках масавай інфармацыі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

## Даты | Падзеі | Людзі

***Міжнародны дзень кіно. 28 снежня 1895 года ў «Вялікім кафэ» на бульвары Капуцынаў у Парыжы адбылася першая публічная дэманстрацыя «жывой фатаграфіі — сінематографа», вынайдзенага братамі Люм'ер.***

**1573** год — нарадзіўся Даніла Набароўскі, паэт, перакладчык, урач. Вывучаў замежныя мовы, у Базелі — медыцыну, у Арлеане і Страсбургу — сачыненні рымскіх аўтараў. Слухаў лекцыі Галілея ў Падуі, стаў яго прыхільнікам. Пасля жыў у Нясвіжы. Змагаўся з эпідэміямі ў Беларусі. На аснове вучэння К. Галена напісаў два медыцынскія трактаты. У вершах і вершаваных лістах Набароўскага змешчаны замалёўкі, якія адлюстроўваюць сацыяльныя супярэчнасці ў Беларусі ў XVI—XVII стст. Памёр у 1640 годзе.



**1895** год — нямецкі фізік Вільгельм Конрад Рэнтген абвясціў свету аб сваім дзіўным адкрыцці. Ён выявіў новы тып электрамагнітных хваль у дыяпазоне паміж ультрафіялетам і гама-выпраменьваннем, якім даў назву «ікс-промні» (x-ray). Незвычайнасць гэтага выпраменьвання заключалася ў тым, што ім можна было прасвяціць наскрозь усё што заўгодна, напрыклад, чалавека — і ўбачыць яго косці. Паглынанне ікс-прамянёў залежыць ад таўшчыні і шчыльнасці рэчыва, таму больш шчыльныя тканкі (косцевыя, напрыклад) выглядаюць на рэнтгенаўскім здымку цямней, чым мяккія (скура, мышцы). Фотаздымак кісці рукі жонкі Рэнтгена ў ікс-промнях зрабіў фурор у медыцынскіх колах: цяпер урачы маглі бачыць унутраныя структуры не толькі пры анатаміраванні трупаў, але і ў жывых пацыентаў! За свае работы ў 1901 годзе даследчык атрымаў Нобелеўскую прэмію.

**1908** год — у Вільні заснавана беларускае кнігавыдавецкае таварыства «Наша хата» (дзейнічала па 1911 год). Яно было арганізавана з мэтай выдання беларускіх падручнікаў і дзіцячай літаратуры на беларускай і іншых мовах. Выпусціла падручнік «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа, ананімную паэму «Тарас на Парнасе», дарожны нарыс «Дзед Завала» Ядвігіна Ш., ілюстраваныя кнігі для дзяцей «Дым» М. Канапніцкай, «Архіп і Лёнька» М. Горкага, навукова-папулярныя выданні.

### Было сказана

**Максім Багдановіч (1891—1917) паэт, перакладчык, публіцыст:**

*«Проці цячэння вады*
*Зможа толькі*
*жывое паплыць,*
*Хвалі ж ракі заўсягды*
*Тое цягнуць,*
*што скончыла жыць».*

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** «Нерв». Поле. Рысь. Кіт. Удар. Ліса. Дула. Абух. Атон. Карп. Зуброўка. Анабар. Сак. Смага. Канцэрн. Тур. Рог. Уша. Палата. Галак. Збор. Унт. Горб. Лікёр. Алат. Салага. Ахіл. Конь. Явар. Кабачок.

**Па вертыкалі:** Чапля. Астрог. Смуга. Тупік. Груша. Ярка. Ракурс. Воўк. Талака. Партулак. Лахор. Дата. Брагін. Луста. Экю. Тальк. Ранак. Пра. Янка. Лукас. Луг. Хабанэра. Рак. Ротар. Вепр. Юнга. Барсук.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.29 | 16.54 | 7.25 |
| Віцебск | — 9.26 | 16.36 | 7.10 |
| Магілёў | — 9.19 | 16.44 | 7.25 |
| Гомель | — 9.06 | 16.49 | 7.43 |
| Гродна | — 9.42 | 17.11 | 7.29 |
| Брэст | — 9.34 | 17.20 | 7.46 |

### Месяц

*Поўня ў 12.22.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Васіля, Паўла, Сцяпана, Трыфана.*
***К.** Эмы, Антона, Цэзара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА 0..+2°С | КІЕЎ -7..-5°С | РЫГА -3..-1°С |
| ВІЛЬНЮС -5..-3°С | МАСКВА -6..-4°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ -9..-7°С |

## УСМІХНЕМСЯ

**— Тата, а ты яшчэ вырасцеш?**
**— Не, сынок.**
**— А навошта ты тады ясі?**

Аб'ява ад 22 снежня.
«Прадам бункер. Тэрмінова».

**Дыялогі ў сеціве, яна і ён.**
**— І наогул, мужчына павінен ведаць толькі пяць слоў: кахаю, куплю, паедзем, добра, даруй.**
**— Ага, а жанчына толькі тры: я гатова, я іду гатаваць.**

Збор твораў Дар'і Данцовай выйдзе ў падарункавым самазвале.





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 26.325. Індэкс 63850. Зак. № 5876.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 27 снежня 2012 года.